Не менее запутанная ситуация сложилась на Подляшье. Исторически эта земля с замками Дорогичин, Бельск, Мельник и Сураж входила в домен князя Кейстута Гедиминовича, а затем и Витовта. Когда Витовт второй раз бежал в Пруссию, король Владислав (Ягайло) в 1391 г. пожаловал Подляшье в пожизненное владение мазовецкому князю Янушу I (1347/1352–1429) [11, s. 112]. Однако, вернувшись в ВКЛ, Витовт к 1394 г. вновь овладел Подляшьем, или по крайней мере его частью с замком Дорогичиным; об этом свидетельствует набег крестоносцев на Дорогичин в январе 1394 г. [12, s. 191].

С учетом политической ситуации 1392–1395 гг. передача Луцка, Владимира-Волынского и земель на Подляшье княгине Анне в качестве вена была серьезным дипломатическим успехом Витовта. Не исключено, что в числе владений, которые передавались княгине Анне, были и некоторые другие русские местности, находившиеся под контролем Витовта, – в Подольской и Киевской землях. Хотя в тексте регеста нет запятой между словами "Podlaskich" и "Ruskich", но соответствующую фразу можно прочитать и так: "y na inszych imionach Podlaskich [,] Ruskich". Включение всех этих земель, прежде всего волынских и подляшских, в веновную запись под залог крупной денежной суммы позволяло Витовту защитить их от притязаний Польского королевства и закрепить за собой юридическое право владения ими.

1. AGAD. – Zespół 354. Archiwum Warszawskie Radziwiłłów. Seria 35. Rękopisy biblioteczne. Sygn. 159.
2. Zawadzki, J. Sumariusz dokumentów Krzysztofa Radziwiłła „Pioruna" z 1604 r. jako źródło do dziejów rodziny i Wielkiego Księstwa Litewskiego / J. Zawadzki // Miscellanea Historico-Archivistica. – 2018. – T. 25. – S. 221–246.
3. Codex epistolaris Vitoldi Magni Ducis Lithuaniae. 1376–1430 / collectus opera A. Prochaska. – Kraków : Druk. Wł. L. Anczyca i sp., 1882. – CXVI, 1114 s.
4. Vitoldiana. Codex privilegiorum Vitoldi, magni ducis Lithuaniae / opr. i wyd. J. Ochmański. – Warszawa etc. : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1986. – 256 s.
5. Nikodem, J. Witold. Wielki książe litewski (1354 lub 1355 – 27 października 1430) / J. Nikodem. – Kraków : Avalon, 2013. – 511 s.
6. Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie / pod kier. Z. L. Radzimińskiego, przy współudziale P. Skobielskiego i B. Gorczaka. – T. 1. 1366–1506. – Lwów : Z druk. Instytutu Stauropigiańskiego, 1887. – XXIX, 204 s., III Tabl.
7. Саввов, Р. В. Подольский полугрошок и денежное обращение в Подольском княжестве / Р. В. Саввов // Банкаўскі веснік. – 2016. – № 3/632 (сакавік 2016). – С. 12–19.
8. Kosman, M. Dokumenty wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Studia Źródłoznawcze = Commentationes. – 1971. – T. 16. – S. 139–169.
9. Akta unji Polski z Litwą. 1385–1791. – Kraków : Polska Akademia Umiejętności; Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1932. – 633 s.
10. Лицкевич, О. В. «Летописец великих князей литовских» и «Повесть о Подолье»: опыт комплексного критического разбора / О. В. Лицкевич. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2019. – 928 с., 16 с. [цв. вкл.].
11. Kodeks dyplomatyczny księstwa Mazowieckiego / wyd. T. J. Lubomirski. – Warszawa: W Drukarni Gazety Polskiej, 1863. – IV, 346, X s.
12. Scriptores rerum Prussicarum. – Bd. 3. – Leipzig : Verlag von S. Hirzel, 1866. – VI, 730 s.

**Дзярновіч А.І.**

## КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АНГЛІЙСКІХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ ДЛЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЫПРАЎ ТЭЎТОНСКАГА ОРДЭНА СУПРАЦЬ ВКЛ У XIV ст. (ВЫПАДАК З "ЧАЛАВЕКАМ З СЭНТ-БІС")

*Ключавыя словы: экспансія Тэўтонскага ордэна; Вялікае Княства Літоўскае; англійская эліта; дакументальныя крыніцы.*

Удзел англійскіх рыцараў ў выправах Нямецкага ордэна ў Прусію і супраць ВКЛ ужо быў прадметам аналізу гістарыяграфіі. Нямецкі Ордэн і новапаўсталая Ордэнская дзяржава ў Прусіі, прынамсі ад 1320 г., актыўна выкарыстоўвалі ў сваіх рэйдах заходнееўрапейскіх "ваенных гасцёў" [13, S. 11] – рыцараў, якія скіроўваліся ў Прусію і далей на Усход з мэтаю атрымання ці ўдасканалення вайсковага досведу ды выканання,

як яны меркавалі, свайго хрысціянскага абавязку па ўдзелу ў зломе супраціву язычнікаў і іх далейшаму хросту.

Выяўленне ў 1981 г. у прыяраце Сэнт-Біс (графства Камбрыя, Англія) парэшткаў унікальным чынам захаванага цела прадстаўніка мясцовай арыстакратыі XIV ст. паставіла на новым узроўні праблему ідэнтыфікацыі персаналіяў у пахаваннях. Даследаванне 2010 г. шкілету Sk100 суседняга жаночага пахавання дазволілі распачаць працэс ідэнтыфікацыі мужчынскага пахавання. Гэты працэс меў поспех толькі ў выніку супастаўлення звестак розных навук: даследаванне базавалася на выніках археалагічнага, генеалагічнага, геральдычнага, мастацтвазнаўчага вывучэння артыфактаў з прыярату Сэнт-Біс, а таксама антрапалагічнага вывучэння выяўленых там захаванага цела (“Чалавека з Сэнт-Біс” / “St Bees Man”) і жаночага шкілету Sk100 з суседняга пахавання. Пры вывучэнні парэшткаў былі выкарыстаны таксама біягеахімічныя (ізатопныя) і радёвугляродныя аналізы. Але канчатковае ўстанаўленне персаналіі, абставінаў смерці і пахавання Чалавека з Сэнт-Біс стала магчымым ў выніку аналізу пісьмовых дакументальных канцылярскіх матэрыялаў Англіі і наратыўных помнікаў ордэнскага хронікапісання. Праведзеныя даследаванні дазволілі ідэнтыфікаваць “Чалавека з Сэнт-Біс” як Энтані дэ Люсі, 3-і барона Люсі.

Задачы артыкула – прадэманстраваць крыніцазнаўчыя магчымасці англійскіх канцылярскіх матэрыялаў у вывучэнні тэмы экспансіі Тэўтонскага (Нямецкага) ордэна ў Паўднёва-Усходнім Балтыйскім рэгіёне, у прыватнасці, у ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў гэтага працэсу.

Абставіны жыцця Энтані дэ Люсі аказаліся дастаткова добра дакументаванымі. Энтані атрымаў у спадчыну маёнткі свайго бацькі Томаса ў 1365 г. і прыняў на сябе яго абавязкі ў Заходняй марцы па ахове англа-шатландскай мяжы. Як можна зразумець, пад час зацішша ў памежных войнах, Энтані дэ Люсі атрымаў каралеўскі дазвол пакінуць Англію. Дзеля фінансавання выправы ён пазычыў значную суму ў 600 фунтаў у фаварыткі караля Алісы Перэрс. 21 лістапада 1367 г. было закончана афармленне здзелкі пра пазыку праз унясенне гэтых звестак у каралеўскія натарыяльныя спісы – “закрытыя рулоны” [1, p. 396]. Але яшчэ 20 лістапада 1367 г. у Вестмінстэры Энтані дэ Люсі была выдадзена каралеўская ліцэнзія на “выправу за моры” (“going beyond seas”) і прызначэнні дзвюх павераных на час адсутнасці яго ў Англіі цягам аднаго году [5, p. 34]. У іншым запісы ад 20 лістапада 1367 г. пра патэнт на адбыццё з порту Дуўр указваецца, што Энтані дэ Люсі адбывае з 15 вершнікамі і ўжо 500 фунтамі на іх утрыманне [5, p. 57]. Гэта была найбольшая світа і фундуш, якія зафіксаваныя ў англійскіх выправах у “прускія рэйды” ў 1367–1368 гг. [9, p. 186] У запісе пра патэнт Энтані дэ Люсі не быў указаны пункт прызначэння, але на гэтым жа тыдні, а таксама ў той жа дзень 20 лістапада, былі выдадзены партовыя патэнты на адплыццё з Дуўру ў “le Pruce” і “Spruciam” (“у Прусію”), у тым ліку для кузена Энтані Джона дэ Мултона (John de Multon) [5, p. 57–58], які таксама пазычыў грошы ў Алісы Перэрс, праўда, значна сціплейшую суму ў 20 фунтаў [1, p. 396] (відавочна, на аднаасобны ўдзел у выправе). Джон дэ Мултон быў сынам Джона дэ Мултона з Фрэмптана (Лінкольншыр) і знаходзіўся пад апекай Томаса Люсі з Кокермута, бацькі Энтані дэ Люсі, таму цалкам верагодна, што яны выраслі ў адной сям’і.

Асоба Джона дэ Мултона для нашай тэмы надзвычай важная, бо менавіта ён пакінуў прамыя сведчанні пра ўдзел Энтані дэ Люсі ў “прускім рэйдзе”. У архіве Мултон-хола былі знойдзены лісты Джона дэ Мултона да сваёй жонкі. 23 лістапада 1367 г. Джон паведамляў, што ў гэты ж дзень ён накіроўваецца ў Прусію (Spruz) разам з Энтані дэ Люсі і Рычардам дэ Уэлбі, што ім будзе прадастаўленае дармовыя ежа і піццё, і што ён спадзяецца вярнуцца з “вялікай выгодай і гонарам”: “Dear wife know that Anthony de Lucy and I and all our company make our way towards the parts of *Spruz* [Prussia] the day of the making of these letters and

that Richard de Welby my companion and I will be at *bouche a court* with the said Anthony ... and that when ... we have anything to do with our enemies it is my wish to be with him, which will be much to my profit and honour" [7, p. 199–200].

Храніст Нямецкага ордэна Віганд з Марбурга паведамляе, што на пачатку 1367 г. у Ніжнім Панямонні разам з ордэнскімі аддзеламі ўжо дзейнічалі англійскія рыцары: "Erant eciam multi peregrine in terra, dominus Bemunt et Nortz Vewater Anglicus, qui cum suis eciam ibidem fuerat" [15, p. 350]. Правадыры англійскага аддзела інтэрпрэтуюцца як барон Бамонт (Henry de Beaumont, 3rd Baron Beaumont (4.IV.1340 – 25.VII.1369)) і Уолтар барон Фіц-Уолтэр (Walter FitzWalter, 3rd Baron FitzWalter; 31.V.1345 – 26.IX.1386) [15, p. 351]. Тут важна звярнуць увагу на сваяцкія сувязі гэтых рыцараў – мачаха Энтані дэ Люсі паходзіла з Бамонтаў, а Уолтар барон Фіц-Уолтэр быў яшчэ адным кузенам Энтані, які, да таго ж, фігураваў як патэнцыйны спадчыннік у справе маёнткаў дэ Люсі [12, p. 300].

Энтані дэ Люсі ўжо не вернецца са сваёй "прускай выправы" на ВКЛ. Запісы пра яго гібель у 1368 г. былі зроблены ў картулярыях (скарончаных актавых копіях) "Інквізіцыі пасля смерці" (Inquisitions Post Mortem) – інстанцыі, якая займалася разбіральніцтвам маёмасных правоў пасля смерці ўладальніка. Спадчынныя пытанні Энтані дэ Люсі разглядаліся вельмі аператыўна – 10 кастрычніка 1368 г. (42 год уладарання караля Эдуарда III) [2, no. 233], а таксама звярталіся да разгляду справы 19 лютага 1375 г. (49 год Эдуарда III) [4, no. 169]. У гэтых актах існуюць супярэчнасці адносна датаў гібелі Энтані дэ Люсі, пазначаюцца 19 жніўня і 16 верасня [9, p. 185–186]. Але ў любым выпадку гэта канец лета – пачатак восені 1368 г. Апроч таго, і гэта важна для нашай тэмы, адзначаецца, што Энтані дэ Люсі "загінуў за марамі" ("he died beyond seas") [4, no. 169].

З гэтай жа выправы не вярнуўся таксама спадарожнік Энтані дэ Люсі Джон дэ Мултон. Справы яго спадчыннасці разглядаліся "Інквізіцыі пасля смерці" 8 лістапада 1368 г. (42 год Эдуарда III) [2, no. 300] і 4 лютага 1373 г. (47 год Эдуарда III) [3, no. 269]. Розныя даты гібелі "ў заморскіх краях" фігуруюць таксама і ў выпадку з дэ Мултонам ("John de Multon died in parts beyond seas"): 18 жніўня ("on Friday before St. Bartholomew") і 29 верасня ("around Michaelmas") 1368 г. як бачым, у любым выпадку даты смерці Джона дэ Мултона і Энтані дэ Люсі ўкладаюцца ў сціслы храналагічны перыяд. Апроч таго, паводле крыніц мы маем імя яшчэ аднаго англійскага рыцара, які загінў пад час рэйда на ВКЛ, верагодна ў 1368 г. У кастрычніку 1367 г. Роджэр дэ Фэлбрыг (Rogar de Felbrigg; нар. 1335) атрымаў каралеўскі патэнт на выезд з Англіі і ў пазнейшых крыніцах яго імя ўжо не сустракаецца [9, p. 186–187]. Але на мармуровай пліце ў нішы замацавана мемарыяльная табліца, усталяванай ягоным сынам Сайманам у царкве Св. Маргарыты ў Фэлбрыгу, у інскрыпцыі было пазначана, што ён "памёр у Прусіі і там пахаванае яго цела": "qi mourut en prus e la est son corps enterre" [11, p. 274].

Звесткі пра ўдзел Энтані дэ Люсі ў крыжовых выправах цыркулявалі сярод рэгіянальных англійскіх эліт яшчэ ў XV ст. У радаводзе баронаў Грэйстокаў (Greystoke), уладанні якога знаходзіліся таксама ў графстве Камбрыя, паведамлялася, што Энтані здзейсніў вандраванне ў *Terra Sancta* (Святую Зямлю): "Johanna postea desponsata fuit Antonio domino de Lucy, qui infra breve obiit in Terra Sancta" [6, p. 301]. Сам жа Энтані дэ Люсі яшчэ 29 красавіка 1366 г. узяў шлюб Джаанай Фіц-Генры – удавой па Уільяму лордзе Грэйстока. Цётка ж Энтані дэ Люсі – Люсі дэ Люсі, – была першай жонкай Уільяма Грэйстока. У 1351–1352 гг. Уільям Грэйсток (*William de Greystoke*, *2rd Baron Greystoke*; 1321–1359) браў удзел у Крыжовай выправе ў Прусію на чале з Генры Гросмантам (Henry of Grosmont, Duke of Lancaster; каля 1310–1361) [8, p. 93–94]. Гэтая акалічнасць, а таксама сваяцкі сувязі паміж лакальнай элітай, паўплывалі на тое, што імя Энтані дэ Люсі было ўнесена ў апісанне радавода

Грэйстокаў. Прыгадка *Terra Sancta* тут можа быць праінтэрпратавана, як сведчанне таго, што Энтані дэ Люсі "ўсклаў на сябе крыж" – стаў удзельнікам крыжовай выправы.

На працягу 1367–1368 гг. асноўныя падзеі ваеннага супрацьстаяння паміж Нямецкім ордэнам і ВКЛ разгортваліся вакол Nowam Cawen / Cawen nowum [15, p. 352–354] – Новага Коўна, літоўскага замка, закладзенага на нёманскай выспе Віргален, каля вусця Нявяжы ў Нёмане, ніжэй Коўна (Каўнаса). Даследчык праблемы ўдзелу еўрапейскай знаці ў прускіх рэйдах Вернэр Паравічыні як верагоднае месца гібелі трох англійскіх рыцараў у верасні 1368 г. пазначае Neu-Kauen (Новае Коўна) [14, S. 117, Tabl. 56]. Таксама Паравічыні праінтэрпрэтаваў паведамленне храніста Германа Вартберга ў "Лівонскай хроніцы" пра гібель ("з нашых трое былі забітыя") у верасні 1368 г. пад Коўна (Kauve), як указанне на гібель менавіта англійскіх рыцараў [14, S. 120]: "Eodem anno et tempore marscalcus devastavit trans Navezam in Letowia has regiones, scilicet Bastowe et Romagyn, perveniensque ad castrum Kauve inopinabiliter secundo reparatum in crastino devicit et expugnavit , víC viros armatos repertos ibi necavit, paucis nobilioribus exceptis, quos secum duxit. De nostris tres de menibus occisi sunt; de vulneratis vita sperabatur" [10, p. 92].

Наяўнасць гістарычных звестак дазваляе сцвярджаць, што ў сярэдзіне XIV ст. прадстаўнікі арыстакратыі і дваранства Англіі рэгулярна ўдзельнічалі ў выправах Нямецкага ордэна на паўночна-заходнія землі ВКЛ, найперш у Сярэднім і Ніжнім Панямонні. У 1367–1368 гг. у такой выправе ўдзельнічала, у тым ліку, група прадстаўнікоў эліты графства Камбрыя, размешчанага на паўночным-захадзе каралеўства. Прамыя і ўскосныя крыніцы дазваляюць сцвярджаць, што не толькі адным з удзельнікаў, але і арганізатарам гэтай выправы быў Энтані дэ Люсі, 3-і барон Люсі (1332/1333 – 19.VIII./16.IX.1368).

Наратыўныя ордэнскія крыніцы (хронікі) могуць даць інфармацыю пра мілітарную кампанію. Магчымасць гэтых крыніц ва ўсталяванні імёнаў замежных удзельнікаў выправы абмежаваныя. Падобную інфармацыю адносна англійскіх удзельнікаў выправы магчыма здабыць, выкарыстоўваючы англійскія дакументальныя матэрыялы ў супастаўленні з крыніцамі іншага паходжання, найперш, ордэнскімі.


1. Calendar of Close Rolls, Edward III / ed. H.C. Maxwell Lyte. – London : Originally published by His Majesty's Stationery Office, 1910. – Vol. 12: 1364–1369. – 674 p. – URL: https://archive.org/details/calendarofcloser12grea/page/396/mode/2up (date of access: 17.02.2025).

2. Calendar of Inquisitions Post Mortem / M.C.B. Dawes, J.B.W. Chapman. – London : by His Majesty's Stationery Office, 1938. – Vol. 12 : Edward III. – XXIX, 603 p. – URL: https://www.british-history.ac.uk/inquis-post-mortem/vol12/pp205-221 (date of access: 17.02.2025).

3. Calendar of Inquisitions Post Mortem / A.E. Stamp, J.B.W. Chapman, M.C.B. Dawes, D.B. Wardle. – London : by His Majesty's Stationery Office, 1954. – Vol. 13 : Edward III. – 437 p. – URL: https://www.british-history.ac.uk/inquis-post-mortem/vol13/pp240-255 (date of access: 17.02.2025).

4. Calendar of Inquisitions Post Mortem / A.E. Stamp [et al.]. – London : Her Majesty's Stationery Office, 1952. – Vol. 14 : Edward III. – 580 p. – URL: https://www.british-history.ac.uk/inquis-post-mortem/vol14/pp182-193#fns (date of access: 17.02.2025).

5. Calendar of the patent rolls preserved in the Public Record Office : Edward III / prepared under the superintendence of the Deputy Keeper of the Records. – London : Printed for H. M. Stationery Off., 1913. – Vol. XIV : A.D. 1367–1370. – 756 p. – URL: https://babel.hathitrust.org/cgi/pt?id=mdp.39015031081105&seq=46 (date of access: 17.02.2025).

6. Chartularium abbathiae de Novo Monasterio ordinis Cisterciensis fundatae anno MCXXXVII / ed. J.T. Fowler. – Durham : Published for the Society by Andrews, 1878. – XXII, 340 p. – URL: https://archive.org/details/chartulariumabba00newm/page/296/mode/2up (date of access: 17.02.2025).

7. Coss, P. The Foundations of Gentry Life: The Multons of Frampton and their World, 1270–1370 / P. Coss. – Oxford : Oxford University Press, 2010. – XII, 323 p.

8. Fowler, K. A. The King's lieutenant: Henry of Grosmont, First Duke of Lancaster, 1310–1361 / K. A. Fowler. – New York : Barnes & Noble, 1969. – 312 p.

9. Grant, A. The St Bees lord and lady, and their lineage / A. Grant // North-West England from the Romans to the Tudors : essays in memory of John Macnair Todd. Extra series no. XLI / ed. Keith J. Stringer. – Carlisle : Cumberland and Westmorland Antiquarian and Archaeological Society, 2014. – XVIII, 288 p.

10. Herman de Wartberge. Chronicon Livoniae / Hrsg. Ernst Strehlke // Scriptores rerum Prussicarum. – Leipzig : S. Hirzel, 1863. – Bd. II. – P. 9–178.

11. Housley, N. «The crusading movement, 1274–1700 / N. Housley // The Oxford Illustrated History of the Crusades / ed. J. Riley-Smith. – Oxford : Oxford University Press, 1997. – P. 260–293.
12. Knüsel, Ch. J. The Identity of the St Bees Lady, Cumbria: An Osteobiographical Approach / Ch. J. Knüsel [et al.] // Medieval Archaeology. – 2010. – Vol. 54, Iss. 1. – P. 271–311.
13. Paravicini, W. Die Preußenreisen des europäischen Adels / W. Paravicini. – Sigmaringen : Thorbecke,1989. – Teil 1. – 396 s.
14. Paravicini, W. Die Preußenreisen des europäischen Adels / W. Paravicini. – Sigmaringen : Thorbecke,1995. – Teil 2. – 346 s.
15. Wigand von Marburg. Nowa kronika pruska / opr. Sławomir Zonenberg, Krzysztof Kwiatkowski. – Toruń : TNT, 2017. – 666 s.

**Цветкова А.С.**

## АНАЛИЗ КАНЦЕЛЯРСКИХ ЗАПИСЕЙ НА ПИСЬМАХ МАГИСТРАТА ЛЮБЕКА В РЕВЕЛЬ XV ВЕКА[1]

*Ключевые слова: Ганзейский союз, ганзейские источники, Любек, Ревель, канцелярские надписи.*

При изучении ганзейской проблематики многие исследователи не раз обращались к деловой переписке городов, как одному из наиболее информативных видов источников. В Таллинском городском архиве (*Tallinna Linnaarhiiv, TLA*) хранится обширная коллекция писем магистрата Любека в Ревель [14], отдельные рукописи из которой не раз публиковались в различных изданиях [7], а также становились объектом различных исследований [1; 2]. Тем не менее в комплексе источники, входящие в эту коллекцию исследованы еще не были. В данной статье будет предпринята попытка изучить канцелярские дорсальные надписи, расположенные на указанных источниках XV в. Выводы, полученные в ходе исследования, помогут расширить имеющиеся знания о специфике коммуникации между ганзейскими городами в это время. Важно отметить, что данная статья является составной частью большой работы по изучению всей коллекции корреспонденции магистрата Любека в Ревель, хранящейся в Таллинском городском архиве, начатой ранее [3].

Историки уже обращались к канцелярским дорсальным надписям, расположенным на ганзейских источниках, однако лишь преследуя цель установить временные рамки и скорость пересылки писем между различными городами [5; 6; 8]. Указанный нами комплекс источников еще не подвергался исследованию подобного характера. Кроме того, канцелярские записи о времени получения писем являются лишь одним типом данных записей, которые встречаются на источниках, что лишь добавляет актуальности данной работе.

В коллекции корреспонденции магистрата Любека в Ревель из Таллиннского городского архива к XV в. относится 539 рукописей, которые систематизированы в четыре тома: в 1 томе находится 157 писем (источники 1400–1450 гг.), во 2 томе – 163 (источники 1455–1480 гг.), в 3 томе – 133 (1481–1490 гг.), в 4 томе – 96 (1491−1499 г.) [10–13]. Тем не менее только на 164 источниках расположены канцелярские записи. Большая часть из данных писем содержат не одну, а несколько различных дорсальных надписей. Чаще всего они находятся вокруг адреса (*Außenadresse*) на оборотной стороне письма, в редких случаях одна из записей дублировалась в правом верхнем углу.

При работе с данным комплексом документов было обнаружено 309 канцелярских записей на 164 источниках. 5 записей принадлежат письмам 1 папки; 145

[1] Информация о финансировании: выполнено за счет гранта Российского научного фонда № 23–18–00166 «Русско-ганзейская «необычная торговля» в условиях балтийских конфликтов конца XV–XVI века», https://rscf.ru/project/23-18-00166/.